УДК 741+378.147.025.7

## Роля вучэбнага рысунка ў сістэме архітэктурнай адукацыі

Барбарчык М. І.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Высокае мастацтва рысавання з'яўляецца адным з крытэрыяў прафесіяналізму і крыятыўнасці будучых архітэктараў. А крыятыўнасць у вучэбным працэсе – гэта фактар, які садзейнічае раскрыццю творчага патэнцыялу, дапамагае знайсці неардынарныя шляхі выхаду з неардынарных сітуацый. Студэнт – будучы архітэктар, які рысуе, авалодвае здольнасцю ўвішна назіраць навакольны свет вачамі мастака, заўважаць незвычайнае ў звычайным. Гэта значыць, выпрацоўваюцца якасці, якія будуць неабходныя ў далейшай прафесійнай яго дзейнасці.

Рысунак з'яўлецца адной з вядучых дысцыплін у навучанні будучага архітэктара. Архітэктар, які валодае мастацтвам рысавання, можа лёгка перадаць на паперы характар аб'екта, карыстаючыся рысункам як інструментам творчага працэсу, як сродкам прафесійнай камунікацыі. І ў рэшце мае магчымасць весці дыялог "архітэктар – выканаўца – спажывец".

Сістэма навучання рысунку прадугледжвае выкананне заданняў з натуры, як падоўжаных, так і кароткатэрміновых. У час рысавання ў студэнта развіваецца правільнае бачанне аб'екта выяўлення, паняцце кампазіцыйнай гармоніі, уменне дакладна выяўляць форму на паверхні аркуша паперы. Набываюцца навыкі графічнай культуры, што дазаляе ствараць ілюзію аб'ёмнасці і прасторавага гучання.

Разглядаючы рысунак у ракурсе агульнаадукацыйнага і натуральна-навуковага яго значэння, неабходна адзначыць наступнае:

- рысавнне дазваляе студэнтам глыбей пазнаваць прыроду;
- у студэнтаў адбываецца развіццё навуковага мыслення;
- засваенне рысунка як прапедэўтычнай дысцыпліны дапамагае пры выкананні сур'ёзных прафесійных задач у архітэктурнай творчасці;
- студэнты, якія рысуюць, набываюць пластычную мову, якая аб'ядноўвае выяўленчае мастацтва і архітэктуру;
- рысунак садзейнічае развіццю індывідуальных якасцей будучага архітэктара;
- праз рысаванне паспяхова развіваецца прафесійна-творчае мысленне, якое шмат у чым уласціва архітэктурнай прафесіі;
- рысунак з'яўляецца базай выяўленчага мастацтва, а яно напаўняе дзейнасць студэнтаў эстэтычным і духоўным пачаткам, які аказвае ўплыў на эмацыйны стан асобы, садзейнічае фарміраванню прафесійнай культуры і здольнасці к самаразвіццю.